# КАБ ВЕДАЛІ І ПАВАЖАЛІ

## ДАСЛЕДАВАННЕ ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ ВОБРАЗА БЕЛАРУСІ Ў ЗАМЕЖНЫХ КРАІНАХ



**Віктар ШАДУРСКІ, доктар гістарычных навук, прафесар**

«Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі!»

*Я. Купала*

**Пытанне аб месцы Беларусі ў сучасным свеце, аб успрыманні яе грамадзянамі іншых краін актыўна абмяркоўваецца прадстаўнікамі беларускага грамадства. Падобныя праблемы цікавяць жыхароў усіх без выключэння дзяржаў. Усе адэкватныя людзі жадаюць, каб іх краіну ведалі і паважалі ў свеце.**

Варта заўважыць, што не створана якой-небудзь матэматычнай формулы, з дапамогай якой можна было б размеркаваць дзве сотні дзяржаў планеты па ўзроўню іх «вядомасці» за мяжой. Думаю, што такая формула і не патрэбна. Кожная краіна, кожны народ, кожная культура ўнікальныя, заслугоўваюць увагі і павагі. Багацце свету – гэта яго разнастайнасць. Аднак у выніку аб'ектыўных і суб'ектыўных абставін некаторыя краіны выклікаюць большую цікавасць, чым іншыя. Сваю ролю ў гэтым адыгрываюць гісторыя дзяржавы, колькасць насельніцтва, геаграфічнае становішча, эканамічны патэнцыял... Адказ на пытанне «Што ведаюць пра Беларусь у свеце?» не з'яўляецца адназначным. Ён мае мноства аспектаў. Разгледзім некаторыя з іх.

**1. Рэспубліка Беларусь, якая ўзнікла пасля распаду СССР, застаецца яшчэ малавядомай краінай для пераважнай большасці насельніцтва Еўропы і свету.**

Разам з тым абсалютна справядлівае сцверджанне аб тым, што беларускі народ зрабіў вялікі ўклад у сусветную і еўрапейскую цывілізацыю. Сотні літаратурных твораў беларускіх аўтараў перакладзены на замежныя мовы і знайшлі шлях да замежнага чытача. Поспехам за межамі краіны карыстаюцца нацыянальныя опера і балет, музычная і танцавальная творчасць прафесійных і самадзейных выканаўцаў. Высокую ацэнку за мяжой атрымалі многія працы беларускага тэатра і кіно, творы выяўленчага мастацтва Беларусі. У залаты фонд агульнаеўрапейскай культуры ўваходзіць народная творчасць, якая захоўвалася і развівалася многімі пакаленнямі беларусаў, нягледзячы на ўсе перашкоды.

У той жа час трэба прызнаць, што гэтыя шматлікія яскравыя старонкі не аб'ядналіся ў адзіны вобраз Беларусі за яе межамі. Як адну з прычын гэтага можна назваць тое, што на працягу многіх стагоддзяў беларускі народ не меў сваёй дзяржаўнасці і з'яўляўся донарам для іншых культур. Напрыклад, у перыяд СССР беларускія літаратура і мастацтва прадстаўляліся за мяжой як неад'емная частка савецкай культуры, якая, у сваю чаргу, атаясамлівалася ў замежных грамадзян з рускай культурай.

**2. Цікавасць да нашай краіны, яе гісторыі і сучаснасці за мяжой не надта хутка, але паступова расце. Гэты працэс значна паскорыўся пасля стварэння незалежнай беларускай дзяржавы.**

На працягу сваёй гісторыі беларускія землі былі не толькі месцам шматлікіх бітваў еўрапейскага маштабу, аб'ектам замахаў з боку суседніх дзяржаў, але і прасторай, дзе перасякаліся сусветныя рэлігіі (каталіцтва з захаду, праваслаўе з усходу, іслам з поўдня і пратэстантызм з поўначы), усходне-хрысціянская і

заходне-хрысціянская цывілізацыі. Вядомы амерыканскі даследчык С. Ханцінгтан нават вызначыў па тэрыторыі Беларусі лінію цывілізацыйнага разлому.

Змяшэнне культурных традыцый, іх узаемапранікненне было настолькі моцнае, што стварала феномен падвойнай нацыянальнай самасвядомасці. Ураджэнцамі беларускай зямлі, якія сталі зоркамі сусветнай культуры, былі Сімяон Полацкі, Адам Міцкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, Станіслаў Манюшка, Ігнат Дамейка, Мікалай Судзілоўскі, Гіём Апалінэр, Марк Шагал і іншыя. Па мове яны адносіліся да іншай культуры, але па месцы нараджэння, па многіх аспектах свайго светапогляду, несумненна, яны прадстаўлялі Беларусь. Разам з тым было б нелагічна дыскутаваць, які народ мае больш правоў на таго або іншага выдатнага дзеяча. Больш правільна ў гэтым выпадку гаварыць, што яны адначасова прадстаўляюць розныя народы і ў канчатковым выніку належаць сусветнай культуры.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны распаўсюдзіўся падыход, згодна з якім сапраўдная гісторыя Беларусі пачалася толькі пасля разгрому германскага фашызму. За Беларуссю трывала замацаваўся вобраз «рэспублікі-партызанкі». Другой апорай вобраза сталі маштабныя поспехі БССР у аднаўленні разбуранай у ваенныя гады гаспадаркі, хуткая індустрыялізацыя і ўрбанізацыя рэспублікі.

Адзначанай вышэй праблематыцы былі прысвечаны многія творы літаратараў, мастакоў, скульптараў Беларусі, якія занялі значнае месца ў сусветнай культуры. У многіх замежных грамадзян успрыманне рэспублікі адбывалася праз асэнсаванне трагедыі беларускага народа, яго гераізм і мужнасць у часы вайны, перажытыя выпрабаванні, выкліканыя найбуйнейшай у гісторыі чалавецтва ваеннай катастрофай.

Разам з тым замежныя госці, якія прыязджалі да нас у якасці турыстаў або даследчыкаў, успрымалі Беларусь як «рэспубліку без нацыянальнай гісторыі і мовы», як «правінцыю Расіі». Свае ўспаміны аб «культурным жыцці» ў Мінску пакінуў амерыканец Лі Харві Освальд: ён атрымаў сумную сусветную вядомасць пасля забойства прэзідэнта ЗША Дж. Кенэдзі. Маючы магчымасць глыбей за звычайных турыстаў пазнаёміцца з савецкай рэчаіснасцю, таму што працяглы час жыў у беларускай сталіцы ў пачатку 1960-х гадоў, у сваім дзённіку адзначаў: «Праца была сумная, а атрыманыя грошы не было дзе траціць». Па тых жа вытрымках з дзённіка, апублікаваных у даласкай газеце «News» у ліпені 1964 года, можна зразумець, што жаданне жыць у СССР у Освальда знікла ў тым ліку і з-за таго, што «тут (у Мінску. – *В. Ш.*) няма ні начных клубаў, ні месц для адпачынку. Ніякіх забаў, акрамя танцулек, якія арганізоўвалі прафсаюзы». «З мяне хопіць», – зрабіў ён выснову *[1]*.

Меркаванне аб тым, што «Мінск з’яўляецца самым сумным горадам у свеце», чамусьці прыйшло ў галаву вядомаму нямецкаму пісьменніку Бертольду Брэхту і было агучана ў размове з усходнегерманскім літаратарам Стэфанам Геймам у студзені 1955 года *[2]*.

Сітуацыя рэзка змянілася пасля атрымання Беларуссю незалежнасці. Ва ўсіх рэгіёнах планеты ўзрасла цікавасць да маладой еўрапейскай дзяржавы. Аднак і сёння паняцце «Беларусь» у розных краінах успрымаецца па-рознаму. «Веданне» Беларусі зніжаецца па лініі: рэспублікі былога Савецкага Саюза, краіны Цэнтральнай Еўропы, якія ўваходзілі ў так званую «сацыялістычную садружнасць», краіны Захаду. У астатніх рэгіёнах свету Беларусь ведаюць яшчэ менш.

**Постсавецкая прастора.** Відавочна, што Беларусь больш ведаюць і паважаюць менавіта на гэтай прасторы. У новых незалежных дзяржавах СНД і Балтыі наша краіна вядома не толькі палітыкам, прадстаўнікам навуковых колаў, але і шырокім пластам насельніцтва. У былых саюзных рэспубліках высока ацэньваецца якасць беларускай прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі,

**ШАДУРСКІ**
**Віктар Генадзьевіч.**
Нарадзіўся ў 1961 годзе ў Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці. У 1979 годзе паступіў на гістарычны факультэт БДУ. У 1988 годзе скончыў аспірантуру БДУ.
Працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам гістарычнага факультэта БДУ. Выбіраўся сакратаром камітэта камсамола БДУ.
У 1992–1997 гадах – начальнік упраўлення міжнародных сувязей БДУ. З лістапада 1997 года – дактарант факультэта міжнародных адносін БДУ.
Доктар гістарычных навук, прафесар.
З 2000 года – намеснік дэкана факультэта міжнародных адносін, з верасня 2008 года – дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ.
Аўтар больш за 100 навуковых работ, надрукаваных у Беларусі і за яе межамі. Сфера навуковых інтарэсаў: знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь, інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы, рэгіён Балтыйскага мора, тэорыя і гісторыя міжнародных адносін.



На XVI Міжнародным фестывалі моладзі і студэнтаў. Каракас (Венесуэла)

працавітасць, гасціннасць і талерантнасць беларусаў. У пасляваенны перыяд ва ўсім СССР шырокую вядомасць атрымалі беларускія фільмы, мастацкая літаратура, прадстаўленая В. Быкавым, А. Адамовічам, І. Шамякіным, У. Караткевічам і многімі іншымі, іншыя выдатныя дасягненні нацыянальнай культуры. Цікавасць да Беларусі, да дзейнасці яе кіраўніцтва застаецца высокай на постсавецкай прасторы і ў цяперашні час. Узаемнаму інтарэсу спрыяе і статус рускай мовы ў якасці адной з дзвюх дзяржаўных, прафесійныя, сямейныя кантакты, што склаліся яшчэ ў савецкі час.

Наша краіна не з'яўляецца «тэра інкогніта» і для дзяржаў Цэнтральнай Еўропы – членаў ЕС. З гэтай групы краін найбольшы інтарэс да Беларусі, на думку аўтара, існуе ў Польшчы, якая мае з намі не толькі агульную працяглую мяжу, але і блізкія гістарычныя, культурныя сувязі. Да трэцяй групы можна аднесці краіны Заходняй Еўропы і ЗША: іх часта аб'ядноўваюць пад агульным паняццем «Захад» або «калектыўны Захад». Пытанне аб тым, што ведаюць пра Беларусь у гэтай частцы планеты, дзе сканцэнтравана палітычная, эканамічная і інтэлектуальная моц свету, неадназначнае. Існуе істотная розніца паміж успрыманнем Беларусі з боку экспертнай супольнасці, адукаваных прадстаўнікоў грамадства, з аднаго боку, і шырокіх пластоў насельніцтва, з другога.

Для большасці апублікаваных у апошнія дзесяцігоддзі прац замежных навукоўцаў характэрны глыбокі аналіз беларускай гісторыі і культуры, шырокае выкарыстанне архіўных крыніц. Адной з сучасных тэндэнцый у даследаваннях Беларусі на Захадзе з'яўляецца пераход ад палітычнай гісторыі, дзе ў цэнтры стаіць дзяржава і яе палітыка, да вывучэння паўсядзённага жыцця і побыту беларусаў.

Варта адзначыць, што менш як за два дзесяцігоддзі ў Заходняй Еўропе сфарміраваліся навуковыя школы, якія дастаткова глыбока займаюцца беларускай праблематыкай. Найбольшы прарыў быў зроблены ў Германіі, дзе апублікаваны дзесяткі кніг на тэмы палітыкі, эканомікі, культуры, мовы нашай краіны. Сярод іх можна адзначыць кнігу нямецкага гісторыка Томаса Бона «Мінск – узорны сацыялістычны горад», якая выйшла ў 2008 годзе *[3]*. Аўтар піша аб тым, што пасля Вялікай Айчыннай вайны беларуская сталіца разам са Сталінградам была вызначана для будаўніцтва «ўзорнага сацыялістычнага горада». У рэалізацыі гэтай канцэпцыі прафесар бачыць унікальнасць Мінска, яго вялікае значэнне ў сусветнай гісторыі гарадоў. Гэты факт набывае ўсё большы сэнс для развіцця замежнага турызму.

Сёння ў Інтэрнэце без усялякіх праблем можна знайсці разнабаковую інфармацыю, у тым ліку сур'ёзную аналітычную, пра Беларусь на англійскай, нямецкай, французскай і іншых мовах. Некалькі гадоў таму ў СМІ паведамлялася пра 12-гадовага брытанскага вучня, які накіраваў пісьмо ў сусветна вядомую энцыклапедыю «Брытаніка», дзе адзначыў памылкі ў матэрыялах аб Беларусі, Расіі і Польшчы *[4]*. Відавочна, што хлопчык меў магчымасць знайсці і праверыць інфармацыю аб нашай краіне ў розных крыніцах.

Многімі экспертамі адзначаецца высокі адукацыйны і навуковы патэнцыял Беларусі, кваліфікаваны рабочы клас, зручнае транзітнае становішча, спры-

яльныя для арганізацыі турызму і адпачынку прыродныя ўмовы, адкрытасць і гасціннасць насельніцтва. У замежных навуковых выданнях можна знайсці як крытыку, так і высокую ацэнку праводзімых у Беларусі рэформ. Так, малады даследчык з Францыі Давід Тэртры ў сваёй дысертацыі прыйшоў да высновы: «Пераходная мадэль, якую абрала Беларусь, паказала сябе не толькі больш справядлівай з сацыяльнага пункту гледжання, але і эфектыўнай эканамічна» *[5]*.
Можна рэзюмаваць, што Беларусь, маладая еўрапейская дзяржава, сярэдняя па памеры тэрыторыі (13-е месца ў Еўропе) і колькасці насельніцтва (14-е месца), атрымала адэкватнае месца ў навуковай літаратуры. Падрыхтаваныя замежнымі навукоўцамі працы дастаткова рэльефна прадстаўляюць беларускую праблематыку за мяжой.
Разам з тым на масавым узроўні сітуацыя выглядае менш аптымістычна. Многія палітыкі, у тым ліку ўцягнутыя ў абмеркаванне «беларускага пытання», а таксама шырокія колы насельніцтва Заходняй Еўропы і ЗША па-ранейшаму маюць самыя павярхоўныя веды пра Беларусь. У асноўным інфармацыя чэрпаецца з публікацый і перадач вядучых медыя-карпарацый, якія асвятляюць перш-наперш палітычныя кампаніі ў нашай краіне. Такога кшталту матэрыялы, па сутнасці, з'яўляюцца крытыкай палітычнай і эканамічнай мадэлі і фарміруюць аднабаковае ўяўленне пра Беларусь. На пераадоленне стэрэатыпаў, якія склаліся на Захадзе ў дачыненні да нашай краіны, накіраваны інтэрв'ю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь вядучым замежным інфармацыйным выданням (The Wall Street Journal, агенцтву «Франс-Прэс», «Файнэншнл таймс», «Франкфуртэр Альгемайнэ Цайтунг», тэлеканалу «Еўраньюс» і іншым). Гэтыя інтэрв'ю сталі значнымі інфармацыйнымі падзеямі ў замежжы.
Аб неабходнасці пераадолення аднабаковасці ў публікацыях пра Беларусь гавораць многія замежныя грамадзяне, якія па розных прычынах наведваюць нашу краіну. Госці з замежжа прызнаюць, што візіт у нашу дзяржаву змяніў іх ранейшыя ўяўленні ў лепшы бок. Яны адзначаюць адкрытасць людзей, добраўпарадкаванасць населеных пунктаў Беларусі.
Такім чынам, у шырокай грамадскай думцы Захаду яшчэ не сфарміраваны аб'ектыўны і адэкватны вобраз Беларусі. Яна па-ранейшаму застаецца для замежнікаў малавядомай тэрыторыяй «паміж Польшчай і Расіяй».

**3. Для таго, каб Беларусь у свеце больш ведалі і паважалі, дзяржаве і грамадству трэба актыўна працягваць мэтанакіраваную работу.**

Зразумела, што па прычыне сціпласці фінансавых рэсурсаў гэтая дзейнасць не можа быць вельмі амбіцыёзнай і дарагой. Разам з тым яна можа і павінна стаць больш сістэмнай, збалансаванай, з высокай аддачай укладзеных сродкаў, зарыентаванай на правядзенне найбольш выйгрышных для Беларусі мерапрыемстваў за мяжой. Нельга сцвярджаць, што такой палітыкі няма. У гэтым напрамку дзейнасць вядзецца на працягу ўсяго перыяду незалежнасці з меншай або большай інтэнсіўнасцю: агульныя абрысы яе бачны ў розных афіцыйных актах апошніх дзесяцігоддзяў. Пра поспехі мерапрыемстваў у сферы культуры, якія праводзяць



Велатурысты з Галанды падарожнічаюць па тэрыторыі ландшафтнага заказніка «Ліпічанская пушча»

прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь за мяжой, рэгулярна паведамляюць айчынныя і замежныя СМІ.

Найбольш плённымі ў гэтай сферы, на мой погляд, з'яўляюцца наступныя напрамкі.

**Па-першае, распаўсюджванне інфармацыі пра Беларусь на аснове выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій (IT).** Сёння галоўнай крыніцай атрымання разнастайнай інфармацыі з'яўляецца Інтэрнэт, таму, найбольш верагодна, асноўныя дасягненні могуць быць менавіта ў гэтай сферы. Прагрэс у выкарыстанні IT дасягнуты вялікі: свае сайты маюць усе міністэрствы, буйныя прадпрыемствы і арганізацыі краіны. Аднак Беларусь павінна ўзмацняць сваю прысутнасць не толькі ў рускамоўным сегменце «сусветнай павуціны», але і ў англамоўным. Ёсць шанс, што пасля падрабязнага віртуальнага знаёмства з нашай краінай у замежніка з'явіцца жаданне наведаць яе ў рэчаіснасці. Таму не варта эканоміць на перакладзе інфармацыі для сайтаў на англійскую альбо іншыя распаўсюджаныя мовы.



Купалле ў Ракаве

**Па-другое, стварэнне сеткі беларускіх культурна-інфармацыйных цэнтраў (як варыянт, Інстытут Беларусі)** у суседніх краінах і дзяржавах, з якімі наша краіна падтрымлівае найбольш інтэнсіўныя сувязі. У такіх цэнтрах можа быць сканцэнтравана падрабязная інфармацыя пра Беларусь, могуць праводзіцца рэгулярныя мерапрыемствы, скіраваныя на папулярызацыю беларускай праблематыкі, таксама фарміравалася б кола актыўных суайчыннікаў. Вопыт дзейнасці падобных структур назапашаны многімі дзяржавамі, у тым ліку і параўнальнымі з нашай па свайму патэнцыялу.

**Па-трэцяе, сур'ёзныя рэзервы існуюць і ў працы з суайчыннікамі, якія жывуць і вучацца ў іншых краінах, з замежнымі выпускнікамі беларускіх ВНУ.** Пашырэнне кола асацыяцый, клубаў беларусаў і выпускнікоў беларускіх ВНУ за мяжой, несумненна, будзе спрыяць распаўсюджванню беларускай культуры і эканомікі ў іншых краінах. Такая дзейнасць вядзецца, але відавочна, што інфармацыі аб ёй у СМІ недастаткова.

**Чацвёрты напрамак – правядзенне маштабных мерапрыемстваў за мяжой.** Беларусь павінна больш актыўна дэманстраваць сябе за мяжой. І хоць маштабныя мерапрыемствы патрабуюць значных сродкаў, але, як правіла, з'яўляюцца добрай інфармацыйнай нагодай і спосабам прадэманстраваць дасягненні. У якасці прыкладу можна прывесці Беларускі інвестыцыйны форум у Лондане ў лістападзе 2008 года. У яго рамках адбылася прэзентацыя інвестыцыйных магчымасцей Рэспублікі Беларусь для прадстаўнікоў сусветнай бізнес-супольнасці, былі арганізаваны прамыя кантакты замежных інвестараў з прадпрыемствамі і банкамі Беларусі *[6]*. Форум выклікаў з'яўленне многіх цікавых публікацый. У якасці яшчэ аднаго прыкладу можна адзначыць Калядны канцэрт беларускіх і польскіх выканаўцаў, які адбыўся 17 снежня мінулага года ў варшаўскім Палацы навукі і культуры – на адной з самых вялікіх у Польшчы канцэртных пляцовак. Набыць білеты на гэта сумеснае мерапрыемства ў Варшаве было немагчыма ўжо за тыдзень. Канцэрт быў з поспехам паказаны і па тэлебачанні *[7]*.

**Напрамак пяты – развіццё турызму.** Турызм з поўным правам можна назваць найбольш эфектыўнай формай знаём-

ства з краінай, фарміравання ўстойлівай цікавасці да яе. Гэтай сферы ў нашай краіне ў апошнія гады надаецца вялікая ўвага. Між тым развіццё турызму – комплексная праблема, якая патрабуе вырашэння многіх задач. У Беларусі шмат робіцца, каб дасягненні найбагацейшай беларускай гісторыі і культуры мелі большую відовішчнасць і выразнасць. Адным са station ўчых прыкладаў можна лічыць аднаўленне Мінскай гарадской ратушы, разбуранай у XIX стагоддзі. Нягледзячы на некаторую крытыку ў адрас праекта, плюсаў у ім значна больш. Ратуша, на наш погляд, паступова становіцца адным з сімвалаў Мінска. Але хацелася б, каб тут больш актыўна аднаўляліся і найбольш відовішчныя традыцыі – ладзіліся рэгулярныя канцэрты старадаўняй беларускай музыкі, касцюміраваныя паказы і гэтак далей.

Яшчэ адным важным праектам па аднаўленню гістарычных аб’ектаў з’яўляецца рэканструкцыя Аўгустоўскага канала – воднай артэрыі, якая звязала ў першай палове XIX стагоддзя Віслу і Нёман. Вялікі патэнцыял для папулярызацыі мае Музей народнай архітэктуры і побыту ў вёсцы Азярцо Мінскага раёна. Пры адпаведным фінансаванні гэты куток ажыўшай беларускай гісторыі можа быць месцам сапраўднага паломніцтва беларускіх і замежных турыстаў.

***

Разам з тым трэба сказаць і аб некаторых праблемах, якія стрымліваюць развіццё міжнародных кантактаў. Вырашэнне многіх з іх не патрабуе вялікіх фінансавых укладанняў – неабходна толькі пачаць зацікаўленае і абгрунтаванае абмеркаванне існуючых перашкод. Гаворка ідзе пра нарматыўную базу па ўезду і знаходжанню ў краіне замежных грамадзян. На мой погляд, гэты працэс залішне забюракратызаваны. Згодна з існуючымі нормамі, замежны грамадзянін, які атрымаў запрашэнне наведаць на кароткі тэрмін Беларусь і атрымаў візу, пасля перасячэння беларускай мяжы павінен яшчэ зарэгістравацца ў раённых органах МУС. Гэтая працэдура не толькі платная, але і патрабуе вырашэння многіх фармальнасцей. Зразумела, што нелегалы, якія з’яўляюцца на нашай тэрыторыі, наўрад ці маюць уязныя візы. Практыкі рэгістрацыі замежных гасцей не існуе ў краінах, якія актыўна прымаюць турыстаў. Трэба памятаць: будуць прыязджаць турысты – будуць развівацца і паслугі, будзе хутчэй развівацца эканоміка.

І, нарэшце, самае важнае. Асновай актыўнай абароны інтарэсаў Беларусі за мяжой з’яўляецца далейшае ўзмацненне беларускай дзяржаўнасці. Беларускія грамадзяне маюць усе падставы лічыць сваю краіну ўнікальнай па многіх аспектах, у тым ліку ў гістарычным і культурным плане, месцам прыцягнення цікавасці прадстаўнікоў іншых краін.

Лічу, развіццё прывабнага вобразу Беларусі патрабуе і большай увагі да беларускай мовы. Гэта ні ў якім разе не супярэчыць існаванню дзвюх дзяржаўных моў, прызнанню вялікага значэння рускай мовы ў жыцці беларусаў. Разам з тым, на наш погляд, у вонкавым абліччы беларускай сталіцы, гарадоў і вёсак павінна больш выразна адчувацца прысутнасць беларускай мовы. Назвы вуліц, прадпрыемстваў і ўстаноў, рэклама і гэтак далей на мове тытульнай нацыі падкрэсліваюць непаўторны нацыянальны каларыт краіны. Як сведчаць назіранні, выкарыстанне беларускай мовы вельмі добра ўспрымаецца пераважнай большасцю гасцей як з Захаду, так і з Усходу. Аднак ніхто больш за саміх беларусаў не будзе клапаціцца пра тое, каб беларуская мова існавала і развівалася.

Беларусі патрэбна нацыянальная кансалідацыя, пазбаўленне ад псіхалогіі «другасортнасці» і «культурнай правінцыі», якая навязвалася працяглы час. З’яўляючыся на працягу стагоддзяў прасторай сутыкнення і перакрыжавання розных культурных уплываў і традыцый, назапасіўшы пры гэтым багаты вопыт захавання сваёй нацыянальнай адметнасці, Беларусь мае ўсе неабходныя ўмовы для стварэння квітнеючага грамадства, здольнага забяспечыць прагрэс ва ўсіх сферах. ■


## ЛІТАРАТУРА

1. Национальный архив Республики Беларусь. – Фонд 4. – Оп. 62. – Д. 657. – Л. 20.
2. Heym, Stefan. Die Langeweile von Minsk // Dokumente zur Kunst-, Literatur- und Kulturpolitik der SED. Hrsg. v. Elimar Schubbe. – Stuttgart, 1972. – S. 1057–1060.
3. Bohn, Thomas M. Minsk – Musterstadt des Sozialismus. Stadtplanung und Urbanisierung in der Sowjetunion nach 1945. Boehlau Verlag GmbH und Cie Koeln Weimar Wien, 2008. 410 s.
4. Британский школьник нашел ошибки в энциклопедии [Электронны рэсурс] Рэжым доступу: http://www.belarustoday.info/?pid=12781. Дата доступу: 25.02.2009.
5. Tertrie David. Les enjeux de souveraineté entre la Russie et son étranger Proche // Doctorat de l’Universite de Caen. Soutenue le 14 decembre 2007. P. 124.
6. Белорусский инвестиционный форум в Лондоне [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.government.by/ru/rus_events20081118.html. Дата доступу: 25.02.2009.
7. Варшавское шоу [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.ont.by/programs/programs/kontyry/arhiv/0036174/. Дата доступу: 15.01.2009.